**19.** Якія назвы месяцаў напісаны па-беларуску няправільна?

*1) февраль; 2) март; 3) май; 4) чэрвень.*

**А)** усе назвы. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

---

**20.** Вызначце з прапанаваных словы, у якіх можна пераставіць літары і атрымаць новыя словы.

*1) соль; 2) шрам; 3) рама.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**21.** Якое слова прапушчана ў народным выслоўі?

*Да пары … ваду носіць.*

**А)** збан. **Б)** кош. **В)** хмара. **Г)** гаспадыня. **Д)** конаўка.

---

**22.** Адгадайце загадку:

*Што за птах у краі*
*Любіць вецер, збожжа,*
*Крыламі махае,*
*А ўзляцець не можа?*

**А)** молат. **Б)** вятрак. **В)** кузня. **Г)** горан. **Д)** каромысел.

---

**23.** Дадзены прыклады: *а) лебяда, асот, пырнік;*
*б) бурак, рэпа, памідор;* *в) яблык, сліва, вішня.*

Як назваць адным словам? Выберыце патрэбныя варыянты: *1) садавіна; 2) пустазелле; 3) гародніна.*

**А)** а-1, б-2, в-3. **Б)** а-1, б-3, в-2. **В)** а-2, б-1, в-3.
**Г)** а-2, б-3, в-1. **Д)** а-3, б-1, в-2.

---

**24.** Дадзены прыклады: *1) корт; 2) сіла; 3) соль; 4) ток.*

Перастаўце літары ў словах так, каб атрымаліся назвы жывёл.

У якім прыкладзе атрымаецца назва жывёлы з вострай мордачкай і доўгім пушыстым хвастом?

**А)** няма такога прыкладу. **Б)** у 1. **В)** у 2. **Г)** у 3. **Д)** у 4.

---

Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб’яднанне «Інтэлектуальныя спаборніцтвы «Конкурс»
220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/
Унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр БА «Конкурс». Заказ 3. Тыраж 18200 экз. Мінск. 2025 г.

# Конкурс па беларускай мове і літаратуры
# «БУСЛІК-2025»

*Чацвер, 13 лютага 2025 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 24 балы;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (8 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 8 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 8 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якой ацэньваецца заданне конкурсу, – 120, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі; у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца даведнікамі, падручнікамі, слоўнікамі, іншымі пісьмовымі або друкаванымі матэрыяламі, электроннымі сродкамі інфармацыі і сувязі забараняецца; не дазваляецца таксама абменьвацца інфармацыяй з іншымі ўдзельнікамі і задаваць пытанні настаўніку; ручка, чарнавік, картка і заданне – гэта ўсё, што патрэбна мець удзельніку;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой і захоўвае іх да падвядзення канчатковых вынікаў;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–2 месяцы пасля правядзення конкурсу.

## Заданне для вучняў 3-4 класаў

**1.** Колькі слоў у скорагаворцы?

*Поляўполібульбуполе.*

**А)** 3. **Б)** 4. **В)** 5. **Г)** 6. **Д)** 7.

---

**2.** Калі заходзяць у госці, гавораць: … .

**А)** “Дабранач!” **Б)** “Прабачце!”
**В)** “Прыемна пазнаёміцца!” **Г)** “Добры дзень!”
**Д)** “Да сустрэчы!”

---

**3.** Выберыце з прапанаваных імёны дзяўчынак.

*1) Ядзя; 2) Сава; 3) Ася; 4) Антон.*

**А)** усе імёны. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

**4.** Знайдзіце на малюнку адгадку на загадку.

*У лесе жыве, у вёсцы кур крадзе.*

**А)**  **Б)**  **В)**  **Г)**  **Д)** 

**5.** У якіх словах напішаце літару ***ы***?

*1) т..граня; 2) м..шаня; 3) ж..рафа.*

**А**) ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 1, 3. **Д)** у 2, 3.

**6.** Падлічыце, колькі ўсяго **[л’]** у словах скорагаворкі.

*Пасадзіла Лілея з ліпы алею.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**7.** Выберыце словы, у якіх 4 літары і 4 гукі.

*1) елка; 2) неба; 3) змяя; 4) поле.*

**А)** усе словы. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

**8.** Якія словы з дадзеных правільна падзелены для пераносу?

*1) а-сі-на; 2) кась-ба; 3) гарб-уз; 4) пад’-ём.*

**А)** усе словы. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

**9.** Дзеясловы адказваюць на пытанні … .

*1) які?; 2) чый?; 3) што?; 4) хто?;*
*5) што рабіць? 6) што зрабіць?*

**А)** 1, 2. **Б)** 2, 3. **В)** 3, 4. **Г)** 4, 5. **Д)** 5, 6.

**10.** Дадзены прыклады: *а) хмарка; б) пярына; в) смяецца.*
Падбярыце да іх словы, з якімі яны будуць рыфмавацца:

*1) даліна; 2) шпарка; 3) льецца.*

**А)** а-1, б-2, в-3. **Б)** а-1, б-3, в-2. **В)** а-2, б-1, в-3.
**Г)** а-2, б-3, в-1. **Д)** а-3, б-1, в-2.

**11.** У якіх словах на месцы пропуску напішаце літару ***ё***?

*1) ц..тка; 2) л..та; 3) в..ска; 4) дз..ці.*

**А)** у 1, 2. **Б)** у 1, 3. **В)** у 2, 3. **Г)** у 2, 4. **Д)** у 3, 4.

**12.** Выберыце няправільна напісаныя словы.

*1) дошдж; 2) лышка; 3) газета; 4) дзежка.*

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**13.** Дадзены словы: *1) пра..да; 2) ла..ка; 3) во..к.*
Якую літару напішаце на месцы пропуску?

**А)** л. **Б)** м. **В)** в. **Г)** ў. **Д)** у.

**14.** Выберыце з прапанаваных прыкладаў толькі сказы.

*1. Свеціць сонца. 2. Добра чытае.*
*3. Ідуць дзеці ў школу. 4. Прыгожыя воблакі.*

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**15.** Якое слова-антонім прапушчана ў спалучэнні?

*Крэйда белая, а вугаль … .*

**А)** цвёрды. **Б)** шырокі. **В)** цяжкі. **Г)** чорны. **Д)** лёгкі.

**16.** Выберыце словы, у якіх літары ***д***, ***з*** абазначаюць два гукі.

*1) подзвіг; 2) адзенне; 3) падземны; 4) падзямелле.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**17.** Якія словы ўжываюцца толькі ў множным ліку?

*1) гуслі; 2) крупы; 3) дровы.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**18.** Дадзены прыклады:

*1) парад; 2) знаходка; 3) адліга; 4) пад’ём.*

У якіх словах ёсць і **[а]**, і **[д]**?

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** у 1, 2. **В)** у 1, 3, 4. **Г)** у 2, 3. **Д)** у 3, 4.